# ИСТОРИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

## СПРАЖКІ СА ЗБОРАЎ ВУЧЭБНАЙ ЛАБАРАТОРЫІ МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ ЯК ЧАСТКА ПАСАВАЙ ГАРНІТУРЫ XIV–XV СТСТ.

**А. Дз. Аксючыц**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, г. Мінск;*
*his.aksyuchiOD@bsu.by;*
*навук. кір. – П. С. Курловіч, канд. гіст.навук, дац.*

У артыкуле разглядаюцца спражкі пасавай гарнітуры часоў Вялікага Княства Літоўскага (XIV–XV стст.), Аналізуецца калекцыя, якая захоўваецца ў зборах вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ. На падставе ўласных распрацовак і прац папярэднікаў прапануецца іх класіфікацыя, марфалогія і датыроўка.

***Ключавыя словы:*** спражкі; XIV–XV стст.; пасавая гарнітура.

Спражка як частка пасавай гарнітуры існавала яшчэ з часоў жалезнага веку. Аб гэтым сведчаць розныя знаходкі, якія былі апісаны ў працы П. М. Кенька «Поясная гарнитура на территории Беларуси (I–XIII вв.)» [5]. Пры гэтым у яго працы не закраналіся спражкі XIV –XV стст. Спражкі на гэты перыяд разглядаліся ў асобных працах па археалагічных помніках такіх аўтараў як: А. В. Квяткоўская, [4, с. 120], М. В. Клімаў [8, с.159; 6, с. 108], В. М. Ляўко [9, с. 386]. У замежнай літаратуры можна вызначыць такія працы як «Buckles 1250–1800» [12], «Ювелирные изделия древнего Новгорода» [10, с. 144]. Літоўскі даследчык Свецікас Яўгеніус, які даследваў могільнікі перыяду Грунвальдскай бітвы, таксама закранаў спражкі цікавячага нас перыяду [11].

Спражкі, якія былі даследаваны аўтарам, былі ўзяты са збораў вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ. Паходжанне спражак выпадковае, таму дакладнае датаванне і месца іх знаходкі вызначыць не магчыма. Асноўным метадам у даследаванні спражак будзе пошук аналагаў у айчынай археалогіі і на тэрыторыі суседніх краін. Таксама спражкі будуць падзяляцца па тыпалогіі, якая выдзяляецца па форме рамкі вырабаў.

Усяго было разгледжана трынаццаць спражак, якія паходзяць з розных рэгіёнаў Беларусі. Сярод іх маюцца чатыры ліравідныя спражкі, тры прамакутныя, тры колавыя і адна D – падобная. Прысутнічае адзін асобнік, які мае агульныя характарыстыкі як з ліравіднай, так і прамакутнай спражкай.

**ЛІРАВІДНЫЯ СПРАЖКІ**

Ліравідныя спражкі былі найбольш пашыраны ў папярэдні перыяд [5, с. 33]. Спражка па форме нагадвае ліру, таму і названа ліравіднай.

Першая мае невядомае паходжанне (*Мал.* 1: № 9; табл.: №1). Спражка пакрыта зялёнай пацінай, на рамцы маецца арнамент у выглядзе рысак. Бачны сляды жалезнай карозіі на месцы мацавання іголкі. Сячэнне спражкі на рамцы прамакутнае з плаўным скосам. На месцы мацавання абойміцы прамакутнае.




Спражкі з фондаў вучэбнай лабараторыі музейнай справы БДУ (малюнак аўтара)

Наступны асобнік паходзіць з в. Збочна Слонімскі раён (*Мал.* 1: № 10; табл.: №2). Спражка пакрыта зялёнай пацінай, са слядамі жалезнай карозіі на месцы мацавання абойміцы. На рамцы маецца арнамент у выглядзе рысак. Сячэнне спражкі на месцы рамкі прамакутнае з плаўным скосам. На месцы абойміцы сячэнне колавае.

Яшчэ адзін асобнік, у якога не вызначана месца паходжання (*Мал.* 1: №13; табл.: №3), дэфармаваны, пакрыты зялёнай пацінай. Мае рэдкі арнамент у выглядзе рысак, які з-за паціны амаль не бачна. У сячэнні спражка на рамцы кроплепадобная, на месцы мацавання абойміцы колавая.

Ліравідная спражка з Магілёўскага раёну (*Мал.* 1: №8; табл.: №4). Пакрыта зялёнай пацінай, дэфармавана. У сячэнні авальная. Іголка адсутнічае. Канец спражкі выцягнуты.

Дataваць гэтыя спражкі можна на перыяд XIV–XV стст. Аналагі маюцца ў Літве, якія былі знойдзены ў з г. Румшышкі і датуюцца на XV ст. [11, с. 66]. На тэрыторыі Беларусі такія спражкі былі знойдзены археолагам М. В. Клімавым на помніку Селішча – 2, дзе датуюцца на XIII–XV стст. [7, с. 304]. Усе асобнікі ліравідных спражак былі выраблены па тэхналогіі ліцця з бронзы. Некаторыя з іх маюць упрыгожванне ў выглядзе рысак. Ліравідныя спражкі спрашчаюцца у адрозненні ад аналагічных вырабаў папярэдняга перыяду [6, с. 156]. Але пры гэтым працягваюць ужывацца і ў XIV–XV стст.

**ПРАМАКУТНЫЯ СПРАЖКІ**

Прамакутныя спражкі маглі мець прамакутную ці трапецыявідную форму.

Першы асобнік мае выгляд трапецыі, паходзіць з паходзіць з Магілёўскага раёну (*Мал.* 1: № 4; табл.: № 5). Спражка па форме ўяўляе сабой прамакутную трапецыю. Маецца паз, куды кладзецца язычок. Пакрыта пацінай, маюцца трэшчыны па баках. Сячэнне рамкі, дзе мацуецца язычок, колавае, у астатніх частках авальнае. Аналагі гэтай спражцы маюцца ў Літве з в. Крумініяй, якія датуюцца на XIV–XV стст. [11, с.79].

Другі асобнік паходзіць з Магілёўскага раёну (*Мал.* 1: № 5; табл.: № 6). Спражка па форме прамакутная, бакавыя часткі маюць авальныя зубцы. Пакрыта зялёнай пацінай. Сячэнне рамкі, дзе мацуецца іголка, колавае, астатняе прамакутнае. Іголка адсутнічае. На жаль, аналагаў гэтай спражцы не было знойдзена, але пры гэтым такіх спражак на больш ранні перыяд таксама не маецца. Таму дataванне гэтай спражкі даволі шырокае – з XIV–XVIII стст.

Трэці асобнік паходзіць з Магілёўскага раёна (*Мал.* 1: № 7; табл.: № 7). Спражка па форме прамакутная, мае аднакутнае звужэнне, на якім знаходзіцца арнамент з рэшткамі белага металу. Сячэнне рамкі прамакутнае, іголка адсутнічае. Аналагі гэтых спражак таксама не былі знойдзены, таму не магчыма вызначыць датыроўку. Узор, які маецца на спражцы, кажа аб тым, што спражка можа быць старажытнарускага перыяду. Але пры гэтым яна можа дataвацца і XIII–XIV стст.

Чацвёрты асобнік паходзіць з Магілёўскага раёну (*Мал.* 1: №3, табл.: № 8). Спражка па форме прамакутная, маюцца выпукласці па кутах спражкі. Іголка адсутнічае. Сячэнне рамкі прамакутнае, з авальным звужэннем на пярэдняй частцы. Аналагі гэтай спражкі маюцца ў Літве ў г. Жулкус, дзе датуюцца XV ст. [11, с. 22].

## КОЛАВЫЯ СПРАЖКІ

Колавыя спражкі маюць форму кола, язычок і арнаментацыю.

Першы асобнік паходзіць з Магілёўскага раёну (*Мал.* 1: № 2; табл.: № 9). Спражка пакрыта зялёнай пацінай. Упрыгожаная рысамі на рамцы. Іголка адсутнічае, маецца паз для яе мацавання. Сячэнне рамкі кроплепадонае, маюцца скосы ўсярэдзіну і звонку.

Асобнік з в. Іванькова Віцебскі раён (*Мал.* 1: № 12; табл.: № 10). Спражка колавая, пакрыта пацінай. Маецца узор у выглядзе невялічкіх бугаркоў. Сячэнне спражкі кроплепадобнае, маюцца адсекі для мацавання іголкі. Захаваўся кавалак іголкі, у дрэнным стане.

Трэці асобнік паходзіць з Магілёўскага раёну (*Мал.* 1: № 6; табл.: № 11). Спражка пакрыта зялёнай пацінай. Іголка захавалася, маецца паз для яго мацавання. Сячэнне рамкі кроплепадобнае. Бачна грань зверху, маецца скос усярэдзіну і звонку.

Такія спражкі былі пашыраны па ўсёй Еўропе, аб гэтым сведчаць знаходкі з Брытаніі, якія датуюцца 1250–1450 гг. [12, с. 14]. Таксама былі знойдзены і ў Літве з помніку Абеляй і г. Паланге, дзе датуюцца XV ст. [11, с. 76; 25, с. 22]. На тэрыторыі Беларусі такія спражкі былі выяўлены ў пахаваннях у Новым Болецку, і датуюцца XIV–XV стст. [1, с.136] Таксама былі знойдзены і пад час раскопак М. В. Клімава Лучна–2. Тут была выяўлена колавая спражка, але пры гэтым яна датуецца XVI–XVII стст. [7, с. 304]. Такім чынам, можна зрабіць высновы, што спражкі падобнага тыпу бытавалі на тэрыторыі Беларусі, хоць і ў навуковых працах такіх асобнікаў не шмат, і датуюцца яны у шырокіх рамках датавання. Але пры гэтым сярод іх даволі шмат выпадковых знаходак.

## D – ПАДОБНЫЯ СПРАЖКІ

Адзіны асобнік D – падобных спражак паходзіць з в. Мерчыцы Пінскага раёна (*Мал.* 1: № 6; табл.: № 12). Спражка пакрыта зялёнай пацінай, маюцца вялікія пашкоджанні ад карозіі. Іголка адсутнічае. Сячэнне рамкі кроплепадобнае, маюцца скосы ўсярэдзіну і звонку. Аналагі гэтых спражак маюцца ў Літве ў г. Румшышкі, якія датуюцца XIV–XV стст. [11, с. 53]. У Беларусі такая спражка была знойдзена М. В. Клімавым пад час раскопак Лучна–1, датуецца на XV–XVI стст. [8, с. 149].

**АСОБНЫ ТЫП**

Месца паходжання гэтай спражкі (*Мал*. 1: № 11; табл.: № 13) невядома. Яе форма – гэта сімбіёз ліравіднай і прамакутнай спражкі. Яна мае прамакутную рамку. Але пры гэтым ніжняя частка, дзе мацуецца іголка, менш, чым верхняя. На рамцы маецца ўзор у выглядзе рысак. Спражка пакрыта зялёнай пацінай.

**ВЫСНОВЫ**

Было разгледжана транаццаць асобнікаў спражак з фондаў вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ. Яны былі падзелены на чатыры тыпы: ліравідныя – чатыры асобнікі, колавыя – тры асобнікі, D – падобныя – адзін асобнік, прамакутныя – чытыры асобнікі. Адна спражка ўяўляе сабой сімбіёз двух тыпаў. Па колькасці больш ліравідных і прамакутных спражак. Датаванне некаторых з іх прыходзіцца на XIV – XV стст. А некаторыя датуюцца шырэй (XIV – XVIII стст.). Спражкі выраблены ў асноўным па адной тэхналогіі – ліцця. Некаторыя спражкі маюць аздабленне ў выглядзе рысак.

У XIV – XV стст. з’яўляюцца новыя тыпы спражак. Частка з іх уяўляе сабой трансфармаваныя вырабы старажытнарускага часу. Найбольш яскравым прыкладам гэтай тэндэнцыі з’яўляюцца ліравідныя спражкі. Яны становяцца больш простымі, атрымоўваюць сціплую арнаментацыю.

Праз спражкі мы можам прасачыць гандалёвыя і культурныя сувязі. Так, прадметы, якія маюць аналагі ў Велікабрытаніі, хутчэй за ўсё былі распаўсюджаны па ўсёй Еўропе. Яны маглі быць прывезеныя ў Вялікае Княства Літоўскае, дзе ўжываліся мясцовымі жыхарамі. Альбо былі згублены замежнымі людзьмі, калі тыя наведвалі ВКЛ. Таксама такія вырабы маглі выраблядца і на месцы, як даніна своеасаблівай шырока распаўсюджанай модзе позняга сярэднявечча.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Археалогія Беларусі: у 4 т. Т 4. Помнікі XIV – XVIII стст. / В. М. Ляўко, М. Ф. Гурын, Ю. А. Заяц і інш.; Пад рэд. В.М. Ляўко і інш. – Мн.: «Беларуская навука», 2001. – 597 с.: іл.
2. *Белявіна, В. М.* Беларускі касцюм / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. – Мінск: Беларусь, 2017. – 463 с.:іл.
3. *Дучыц, Л. У.* Касцюм жыхароў Беларусі (X – XIII стст.) / Л. У. Дучыц. – Мінск: “Навука і тэхніка” 1995. – 78 с.
4. *Квятковская, А. В.* Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI – XVII вв.) / А. В. Квятковская. – Вильнюс: Dziemendzio, 1998. – 476 с.

5. *Кенько, П. М.* Поясная гарнитура на территории Беларуси (I – XIII вв.). Свод археологических источников / П.М. Кенько. – Минск: Беларус. Навука, 2012. – 172 с.
6. *Клімаў, М.В.* Даследаванне селішча Ворань як адлюстраванне праблемы вывучэння вясковых паселішчаў другой паловы XIII – пачатку XVI стагоддзя / М. В. Клімаў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі – Мінск, 2016. – С. 106 – 119.
7. *Клімаў, М. В.* Археалагічныя доследы на помніках Полацкага Падзвіння ў 2012 годзе / М. В. Клімаў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі, Вынікі даследаўння першабытных і сярэдняявековых старажытнасцей Беларусі ў 2011 - 2012 гадах. – Мінск, 2014. – С. 301 – 307.
8. *Клімаў, М. В.* Археалагічны комплекс Лучна – 1 у акрузе Полацка (XI – XVI стст.) / М. В. Клімаў. – Мінск: Беларуская навука, 2019. – 567с.: іл.
9. *Левко, О. Н.* Друцк и Друцкая волость (княжество) / О.Н. Левко [и др.]; под ред. О. Н. Левко. – Минск: Беларуская навука, 2014. – 619 с.
10. *Седова, М. В.* Ювелирные изделия древнего Новгорода (X – XV вв.) / М.В. Седова. – Москва: 1981. – 198 с.
11. *Svetikas, E.* Zalgirio epochos lietuviu ir zemaiciu kariu kapai su ginklais / E. Svetikas. – Vilnius: “Diemedzio” leidykla, 2011. – 236 p.
12. *Whitehead, R.* Buckles 1250 – 1800 / R. Whitehead. – Coggeshall, Colchester “Greenlight Publishing”, 2003. – 128 p.

**Каталог спражае з фондаў вучэбнай лабараторыі музейнай справы БДУ**

| № | Паходжанне | Малюнак | Памеры |
|---|---|---|---|
| **Ліравідныя** | | | |
| 1 | - | Мал. 1: №9 | даўжыня 19 мм. шырыня рамкі 20 мм. шырыня ніжняй часткі 14.5 мм. сячэнне 2 мм. вага 1.43 г. |
| 2 | в. Збочна Слонімскі раён | Мал. 1: №10 | даўжыня 22 мм. шырыня рамкі 22 мм. шырыня ніжняй часткі 17 мм. сячэнне 3 мм. вага 3.47 г |
| 3 | - | Мал. 1: №13 | даўжыня 19 мм. шырыня рамкі 19 мм. шырыня ніжняй часткі 1.4 мм. сячэнне 2.5 мм. вага 1.25 г. |
| 4 | Магілёўскі раён | Мал. 1: 1 №8 | даўжыня 18 мм. шырыня 18 мм. дыяметр сячэння 2.5 мм. вага 1.44 г. |
| **Прамакутныя** | | | |
| 5 | Магілёўскі раён | Мал. 1: №4 | даўжыня 25 мм. шырыня 18 мм. дыяметр сячэння дзе мацуецца язычок 3 мм. у іншых мясцінах 4x2 мм. вага 1.92 г. |
| 6 | Магілёўскі раён | Мал. 1: №5 | даўжыня 17 мм. шырыня 16 мм. дыяметр сячэння дзе мацуецца іголка 2 мм. усё астатняе 2x3 мм. вага 2,25 г. |
| 7 | Магілёўскі раён | Мал. 1: №8 | даўжыня 21.5 мм. шырыня 16 мм. сячэнне 2x2 мм. вага 1.81 г. |
| 8 | Магілёўскі раён | Мал. 1: №3 | даўжыня 20.5 мм. шырыня 22.5 мм. сячэнне 3 мм. вага 2.77 г. |
| **Колавыя** | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 9 | Магілёўскі раён | Мал. 1: №2 | дыяметр 21 мм. сячэнне 4 мм. вага 2.26 г. |
| 10 | в. Іванькова Віцебскі раён | Мал. 1: №12 | дыяметр 22 мм. дыяметр сячэння 3 мм. вага 1.82 г. |
| 11 | Магілёўскі раён | Мал. 1: №6 | дыяметр 23 мм. дыяметр сячэння 3.5 мм. іголка 21 мм. вага 2.48 г. |
| **D – падобныя** | | | |
| 12 | в. Мерчыцы Пінскі раён | Мал. 1: №1 | даўжыня 18.5 мм. шырыня 17 мм. сячэнне 3.5 мм. |
| **Асобны тып** | | | |
| 13 | - | Мал. 1: №11 | даўжыня 11 мм. шырыня рамкі 11 мм. шырыня ніжняй часткі 9 мм. вага 1.08 г. |